# ВОДЗЫЎ

афіцыйнага апанента, доктара гістарычных навук, дацэнта
В. В. Даніловіча на кандыдацкую дысертацыю К. Д. Ананькі
"Беларускія гімназіі ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.)"

*1. Адпаведнасць дысертацыі спецыяльнасці і галіне навукі, па якіх яна прадстаўлена да абароны.* Дысертацыйнае даследаванне, прадстаўленае К. Д. Ананькам на суісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук цалкам адпавядае спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя.

*2. Актуальнасць тэмы дысертацыі.* Дысертацыя, падрыхтаваная К. Д. Ананькам, прысвечана маладаследаванай тэме. Да гэтага часу ў беларускай і замежнай гістарыяграфіі адсутнічаюць спецыяльныя працы, прысвечаныя комплекснаму даследаванню гісторыі беларускіх гімназій у Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. Дысертацыя суіскальніка запаўняе дадзены прабел у вывучэнні гісторыі Беларусі. На сённяшні час у айчыннай гістарыяграфіі асаблівая ўвага звернута на вывучэнне нацыянальных працэсаў на беларускіх землях у XX ст. і развіцця беларускай дзяржаўнасці. Беларускія гімназіі ў Заходняй Беларусі актыўна ўплывалі на дадзеныя працэсы і забяспечвалі пашырэнне нацыянальнай самасвядомасці. Аналіз іх дзейнасці дазваляе грунтоўна прасачыць развіццё гэтых працэсаў ў моладзевым асяроддзі Заходняй Беларусі. Дадзеныя ўстановы адукацыі з'яўляюцца прыкладам выхавання патрыятызму і павагі да нацыянальных каштоўнасцей сярод моладзі. На сучасным этапе развіцця гістарычных ведаў актуальным з'яўляецца ўвядзенне ў навуковы зварот новых матэрыялаў і фактаў аб складаных працэсах гісторыі Заходняй Беларусі ў міжванны перыяд, што з'яўляецца адной з прыярытэтных задач дзяржаўнай гістарычнай палітыкі сучаснай Беларусі. Тэма, абраная суіскальнікам, з'яўляецца актуальнай і навукова значнай. Вынікі даследавання ўяўляюць інтарэс для органаў улады Рэспублікі Беларусь і грамадскіх структур, а таксама запатрабаваныя для далейшай навуковай распрацоўкі гісторыі Беларусі.

*3. Ступень навізны вынікаў, атрыманых у дысертацыі, і навуковых палажэнняў дысертацыі, якія выносяцца на абарону.* Навізна навуковых вынікаў, атрыманых у дысертацыйнай працы К. Д. Ананька, абумоўлена распрацоўкай першага спецыяльнага комплекснага даследавання гісторыі беларускіх гімназій у Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. Суіскальнік з улікам апошніх дасягненняў гістарычнай навукі ўпершыню ў гістарыяграфіі аб'ектыўна раскрыў спецыфіку беларускіх сярэдніх навучальных устаноў як аднаго з цэнтраў нацыянальна-культурнага жыцця беларусаў на тэрыторыі заходнебеларускага рэгіёна ва ўмовах ажыццяўлення польскімі ўладамі палітыкі паланізацыі; абгрунтаваў ролю беларускіх гімназій у захаванні нацыянальнай самасвядомасці беларусаў; распрацаваў навуковую перыядызацыю іх дзейнасці; выявіў грамадска-палітычныя ўмовы ўтварэння беларускіх гімназій і іх прававое становішча; разгледзіў праекты па ўтварэнні беларускіх сярэдніх школ у розных рэгіёнах Заходняй Беларусі; на аснове статыстычных і біяграфічных дадзеных склаў калектыўны партрэт педагагічнага корпуса і вучнёўскага складу беларускіх гімназій; адлюстраваў удзел беларускіх гімназій у грамадска-палітычных працэсах Заходняй Беларусі.

Навуковыя вынікі, атрыманыя ў дысертацыйным даследаванні і вынесеныя на абарону, вызначаюцца навізной. Дысертацыя К. Д. Ананькі з'яўляецца арыгінальнай даследчыцкай працай, падрыхтаванай з выкарыстаннем шырокага кола архіўных матэрыялаў, большасць з якіх упершыню ўведзена ў навуковы абарот. Дакументальныя крыніцы па даследуемай праблеме выяўлены суіскальнікам у 22 фондах 6 архіваў Літвы і Беларусі.

*4. Абгрунтаванасць і даставернасць вывадаў і рэкамендацый, сфармуляваных у дысертацыі.* Абгрунтаванасць і верагоднасць навуковых высноў, да якіх у дысертацыйным даследаванні прыходзіць К. Д. Ананька грунтуецца на асноватворных навуковых прынцыпах і спецыяльных метадах гістарычнага пазнання.

Дысертацыя напісана на грунтоўным навукова-метадычным узроўні. У ёй выкананы асноўныя патрабаванні навуковага аналізу, такія як сістэмнасць, паўната, усебаковасць і дакладнасць. Мэта даследвання, як гэта сфармулявана дысертантам – раскрыць станаўленне і асаблівасці развіцця беларускіх гімназій у Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд, іх уплыў на захаванне нацыянальнай ідэнтычнасці ва ўмовах палітыкі паланізацыі. Пад час праведзенай працы, на наш погляд, суіскальнікам паспяхова былі вырашаны пастаўленыя задачы: вызначаны і абгрунтаваны перыяды дзейнасці беларускіх гімназій у Заходняй Беларусі; выяўлены сацыяльны, нацыянальны, канфесійны склад вучняў і прафесійны ўзровень педагагічных калектываў беларускіх гімназій; раскрыты уплыў грамадска-палітычных працэсаў у міжваеннай Заходняй Беларусі на стан і ўнутранае жыццё беларускіх гімназій; вызначана спецыфіка беларускіх гімназій як аднаго з цэнтраў нацыянальна-культурнага жыцця і барацьбы беларусаў супраць палітыкі паланізацыі ў Заходняй Беларусі.

Даследаванне праведзена на грунтоўнай метадалагічнай базе, аснову якой склалі прынцыпы гістарызму і аб'ектыўнасці, каштоўнасны і сістэмны падыход. Выкарыстанне ж у якасці канкрэтных метадаў даследавання агульнанавуковых метадаў аналіза і сінтэза, а таксама спецыяльна-гістарычных метадаў (гісторыка-генетычны, гісторыка-сістэмны, параўнальна-гістарычны, гістарычная перыядызацыя, прасапаграфічны) бясспрэчна забяспечвае верагоднасць вынікаў даследавання.

Структура дысертацыі з'яўляецца добра прадуманай і лагічна выверанай. Змест даследавання адпаведае яго назве. К. Д. Ананька прысвяціў асобныя часткі даследавання разгляду працэсу ўтварэння і ўмоў дзейнасці беларускіх гімназій, іх кадравага і вучнёўскага складу, месца і ролі беларускіх гімназій у грамадска-палітычных і культурных працэсах Заходняй Беларусі.

Вывады, якія робіць суіскальнік лагічна вынікаюць з праведзенага даследавання і з'яўляюцца цалкам абгрунтаванымі, узважанымі і верагоднымі.

*5. Навуковая, практычная, эканамічная і сацыяльная значымасць вынікаў дысертацыі з указаннем рэкамендацый па іх выкарыстанні.* Вынікі, палажэнні, факталагічны матэрыял даследавання К. Д. Ананькі раскрываюць важны напрамак гісторыі Беларусі. Асаблівую навуковую значнасць дысертацыі надае ўвядзенне ў навуковы абарот значнай колькасці новых дакументальных матэрыялаў, на грунце якіх суіскальнікам падрыхтавана і змешчана ў дысертацыйнай працы вялікая колькасць змястоўных і грунтоўных дадаткаў.

Практычная значнасць дысертацыйнай працы заключаецца ў магчымасцях выкарыстоўваць вынікі даследавання ў працэсе падрыхтоўкі абагульняючых прац па айчыннай гісторыі, падручнікаў, вучэбных і вучэбна-метадычных дапаможнікаў, спецыяльных курсаў па гісторыі Беларусі, а таксама ў выкладанні гісторыі ў навучальных установах розных ступеняў і тыпаў. Дысертацыя ўяўляе пэўны інтарэс для органаў улады Рэспублікі Беларусь і грамадскіх структур.

*6. Апублікаванасць вынікаў дысертацыі ў навуковым друку.* Асноўныя палажэнні, якія выносяцца на абарону, і вынікі даследавання прайшлі апрабацыю на 18 навуковых і навукова-практычных канферэнцыях розных узроўняў, знайшлі адлюстраванне ў 22 навуковых артыкулах, 9 з якіх надрукаваны ў навуковых рэцэнзаваных часопісах, 7 – у зборніках навуковых артыкулаў, 6 – у матэрыялах і тэзісах навуковых канферэнцый агульным аб'ёмам 10,6 друкаваных аркушаў.

Аўтарэферат дысертацыі змяшчае асноўныя вынікі і палажэнні праведзенай навуковай працы, цалкам адпавядае зместу дысертацыйнага даследавання.

*7. Адпаведнасць афармлення дысертацыі патрабаванням ВАК.* Змест дысертацыі, яе структура, а таксама аўтарэферат выкананы ў адпаведнасці з патрабаваннямі ВАК Рэспублікі Беларусь па афармленні дысертацыйных даследаванняў.

Дысертацыя складаецца з пераліку ўмоўных абазначэнняў і скарачэнняў, уводзін, агульнай характарыстыкі працы, 4 глаў, заключэння, бібліяграфічнага спіса выкарыстаных крыніц і літаратуры агульнай колькасцю 350 найменняў (з іх 22 аўтарскіх), 8 дадаткаў. Поўны аб'ём дысертацыі складае 169 старонак, у тым ліку 23 старонкі бібліяграфіі і 27 старонак дадаткаў.

*8. Адпаведнасць навуковай кваліфікацыі суіскальніка вучонай ступені, на якую ён прэтэндуе.* Аналіз зместу, выкарыстаных метадаў навуковага пошуку і атрыманых вынікаў, адлюстраваных у кваліфікацыйнай працы і аўтарэфераце дысертацыі К. Д. Ананькі, дае падставы для наступных высноў:

– па-першае, прадстаўленая дысертацыйная праца носіць завершаны характар і выканана ў адпаведнасці з патрабаваннямі ВАК Рэспублікі Беларусь, якія існуюць у дачыненні да работ падобнага кшталту;

– па-другое, дысертант валодае дастатковай навуковай кваліфікацыяй для правядзення навуковых даследаванняў на суісканне ступені кандыдата гістарычных навук;

– па-трэцяе, навуковая кваліфікацыя суіскальніка адпавядае вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя.

Навуковая экспертыза матэрыялаў дысертацыйнага даследавання і аўтарэферата прыводзіць да заключэння, што К. Д. Ананька самастойна сабраў, абагульніў і прааналізаваў вялізны пласт дакументальных матэрыялаў і гістарыяграфічных крыніц, на аснове якіх упершыню ў нацыянальнай гістарыяграфіі ажыццявіў комплекснае даследаванне гісторыі беларускіх гімназій у Заходняй Беларусі у 1921–1939 гг. Гэта сведчыць аб атрыманых і замацаваных навыках, уменнях, вопыце навуковай працы, прафесіяналізме даследчыка.

*9. Заўвагі і пажаданні.* Ацэньваючы ў цэлым станоўча даследаванне К. Д. Ананькі, разам з тым, выкажам шэраг заўваг.

Перш за ўсё адзначым, што ў асноўным тэксце дысертацыі утрымліваюцца матэрыялы, якія выходзяць за храналагічныя межы даследавання, бо датуюцца 1919–1920 гг. Больш таго, у заключэнні дысертант вызначае этап станаўлення і развіцця беларускай сярэдняй адукацыі ў заходнебеларускім рэгіёне, які пачынаецца ў 1919 г., а палажэнні, якія выносяцца на абарону ўключаюць падзеі 1918–1920 гг. Гэта робіць вызначаныя храналагічныя межы дысертацыйнага даследавання незусім карэктнымі.

Таксама незусім карэктна назва главы 3. Паняцце кадравы склад шырэй за педагагічны корпус, бо ўключае дапаможны персанал, але аб ім ў главе не ўтрымліваецца звестак.

Спіс скарачэнняў варта было цалкам даць на беларускай мове, без выключэння для Камандавання акруговага корпуса і Літоўскага цэнтральнага дзяржаўнага архіву.

На с. 6 некарэктна вызначаны храналагічныя межы польска-савецкай вайны, бо баявыя дзеянні скончыліся ў 1920 г.

На с. 13 памылкова ўказана, што дысертацыя складаецца з 3 глаў.

На с. 71 з тэксту вынікае, што ў беларускіх гімназіях навучалася шмат яўрэяў. Нажаль дысертант не тлумачыць прычын гэтай з'явы. А было б цікава даведацца, чаму яўрэйская моладзь ішла ў беларускія гімназіі, а не польскія?

На с. 72 суіскальнік сцвярджае, што ў Віленскай беларускай гімназіі ў 1933 г. навучаліся 24 гімназісты з ліку дзяцей дзяржаўных чыноўнікаў. Калі гэта не памылка, цікава даведацца, хто былі гэтыя чыноўнікі і як польскія ўлады адносіліся да гэтага факту?

На с. 89 некарэктна ўжываецца выраз "адраджэнне беларускай народнасці", бо яна сфарміравалася яшчэ ў XVI ст. і нікуды не знікала, а пастунова ператваралася ў беларускую нацыю.

На с. 90 выкарыстоўваецца выраз "палітычная партыя Беларуская сялянска-работніцкая грамада". Наколькі гэта карэктна? Якія крыніцы называюць БСРГ палітычнай партыяй?

На с. 91 у дачыненні да пахавання Ю. Юхно выкарыстоўваецца множны лік. Хіба яго хавалі некалькі разоў?

На с. 114 з тэксту перадапошняга абзаца незразумела, якая ўстанова магла ганарыцца шырокай плеядай творчых кадраў?

Маюцца ў дысертацыі і памылкі друку.

Разам з тым, выказаныя заўвагі не зніжаюць навуковы ўзровень дысертацыйнага даследавання. У цэлым яны не мяняюць агульнай станоўчай адзнакі дысертацыі, не змяншаюць яе галоўных вартасцей.

*10. Высновы і рэкамендацыі.* Прадстаўленая дысертацыя з'яўляецца кваліфікацыйнай навуковай працай, яе змест адпавядае патрабаванням пп. 19–20 Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеняў і званняў.

Такім чынам, у адпаведнасці з патрабаваннямі пп. 19–20 Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеняў і прысваенні вучоных званняў суіскальніку К. Д. Ананьку можа быць прысуджана вучоная ступень кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя – за:

- распрацоўку першага спецыяльнага комплекснага даследавання гісторыі беларускіх гімназій у Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг.;
- вызначанне і абгрунтаванне перыядаў дзейнасці беларускіх гімназій;
- выяўленне сацыяльнага, нацыянальнага, канфесійнага складу вучняў і прафесійнага ўзроўню педагагічных калектываў беларускіх гімназій;
- раскрыццё ўплыву грамадска-палітычных працэсаў на становішча і ўнутранае жыццё беларускіх гімназій;
- высвятленне спецыфікі беларускіх гімназій як аднаго з цэнтраў нацыянальна-культурнага жыцця і барацьбы беларусаў супраць палітыкі паланізацыі.

Доктар гістарычных навук,
дацэнт, намеснік старшыні
Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў
Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
па адукацыі, культуры і навуцы В. В. Даніловіч

Отдел по защите государственных секретов и кадровой работе

ВЕРНО
Начальник отдела по защите
государственных секретов
и кадровой работе
Т.А. Балашенко